# Высокі стандарт

**Красавіцкі нумар часопіса працягвае пачаты ў мінулым годзе праект "Культура са знакам якасці". Гэтым разам выпуск прысвечаны Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту культуры і мастацтваў.**




■ Як падкрэслівае ва ўступным артыкуле рэктар, кандыдат мастацтвазнаўства Наталля Карчэўская, БДУКМ — найбуйнейшая ўстанова вышэйшай адукацыі ў сферы культуры, адзін з сістэмаўтваральных элементаў нацыянальнай адукацыйнай прасторы. Універсітэт ажыццяўляе падрыхтоўку па 16 спецыяльнасцях (29 прафілізацыях), па 6 спецыяльнасцях паглыбленай вышэйшай адукацыі.

■ Падрабязней з адукацыйнай, інавацыйнай і навуковай дзейнасцю факультэтаў знаёмяць іх кіраўнікі і спецыялісты: дэкан факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Юлія Галкоўская, загадчык кафедры інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці Надзея Вайцяховіч; дэкан факультэта культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці Наталля Шалупенка, дацэнт кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці Вольга Рагачова; загадчык кафедры музычна-тэарэтычных дысцыплін факультэта музычнага і харэаграфічнага мастацтва Наталля Дожына, дацэнт кафедры Вольга Лойка; дэкан факультэта мастацкай культуры Алена Пагоцкая.

■ Дырэктар Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Аляксандр Філіпаў расказвае, што ўстанова арганізоўвае штогадовае павышэнне кваліфікацыі каля 2000 кіруючых работнікаў і адмыслоўцаў у сферы культуры, а таксама ажыццяўляе перападрыхтоўку па 13 спецыяльнасцях.

■ Адна з асноўных задач БДУКМ — выхаванне патрыётаў. На гэта, а таксама на захаванне гістарычнай памяці накіраваны харэаграфічны ваенна-патрыятычны праект "Лінія памяці. Код вайны".

■ З мэтай арганізацыі ўмоў для развіцця творчых здольнасцей навучэнскай і студэнцкай моладзі ў структуры ўстановы пачала работу мастацкая галерэя "Універсітэт культуры". Падрабязней пра яе дзейнасць распавядае дырэктар Марына Татарэвіч.

■ Тэрыторыяй творчасці і спорту з'яўляецца спартыўна-культурны цэнтр БДУКМ. Начальнік цэнтра Валерый Грамада знаёміць з работай трох яго аддзелаў.